# Залік. І студэнты танцуюць

***Кажуць, што весела жывуць студэнты ад сесіі да сесіі. Але не менш вясёлай можа быць і сесія. Прапаную завітаць да студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Хто быў студэнтам, добра памятае, як здаваў залікі і экзамены пад час вучобы ва ўніверсітэце. Залік – вусны ці пісьмовы адказ студэнта на пытанні выкладчыка. А студэнты «кулька» здаюць залік незвычайным чынам. Напрыклад, у выглядзе канцэрта па дысцыпліне «Народны танец».***



Пад музыку гарманіка і скрыпкі хлопцы і дзяўчаты весела кружацца ў народным танцы, спяваюць песні. Каб здаць залік, студэнтам 501-й групы пятага курса неабходна было выканаць праграму з 9 танцаў. Былі тут сольны танец («Мікіта», «Таўкачыкі», «Зайчык», «Мікіта з паясамі»), карагоды («Карагод вялікі», «Цар», «Шось у лесе», «А мы проса сеялі», «Што й на вуліцы», «Чарнушка», «Наша вуліца была шырокай», «Пцічкі»), а таксама гуртавыя, парна-гуртавыя танцы, танец тройкамі і імправізацыя («Да Лявоніхі»).

Пасля паспяховай здачы заліку, які прымаў Мікола Аляксеевіч Козенка (дарэчы, даўні сябар і аўтар нашай газеты), я папрасіў студэнтаў расказаць пра іх спецыяльнасць.

«Да 5 курса мы вучылі народныя песні, абрадавыя і абрады і розныя танцы, – распавяла Кацярына Міхнавец. – Нашая спецыяльнасць – "Спецыяліст па фальклоры, абрадазнаўца". Пасля заканчэння можам быць выкладчыкамі па фальклоры, абрадазнаўстве, працаваць у метадычным цэнтры».

«Насамрэч нашая спецыяльнасць прадугледжвала больш тэарэтычны курс, а не практычны, – дадала Лідзія Бохан. – Мы павінны былі разбірацца ў абрадах ды іх сімволіцы, у этапах абрадаў. У тым ліку, мы, як абрадазнаўцы, вывучалі прадметы і ў практычным плане – танец і песні, бо, зразумела, што ніякі абрад не абыходзіцца без іх. Працаваць можна і ў агульнаадукацыйнай школе – весці фальклорны гурток, і ў Доме фальклору, у метадычным цэнтры; а таксама ў нашыя абавязкі ўваходзіць архіваванне і запіс абрадаў, што існуюць у Беларусі».

**– Чым для вас цікавы народны танец?**

– Гэта вельмі важны момант у камунікацыі паміж людзьмі. Ён дапамагае лепш разумець сваё асяроддзе, грамадства, сябраваць з людзьмі, я так лічу. Вельмі спатрэбіцца таксама, калі паедзем у вёску рэканструяваць абрады. Ніводзін абрад немагчыма правесці без танца, вячоркі ці калядныя святы – усё з танцамі. Як без іх?

На спецыялістаў па фальклоры і абрадазнаўстве кладзецца адказная задача – захаванне і аднаўленне народных традыцыяў, абрадаў, танцаў, песняў. Упэўнены, што яны са сваёй задачай справяцца.

*Алесь* **САЧАНКА,**
*фота аўтара*




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ